# «НОЧ ПЛЫЛА АГНЯМІ І ЗОРАМІ...



## «НАРАДЗІЎСЯ ЯНКА КУПАЛА»

**Уладзімір КАРАТКЕВІЧ**

### У ТУЮ НОЧ

Кветка ў нетрах лясных распускалася,
Залатая, агністая, сіняя,
На Купаллі, на росным Купаллі,
Ў бураломнай лясной лагчыне.
У глушы, дзе туманы белыя,
Дзе жывуць лесуны і трасца,
Як заўсёды, шукалі смелыя
Кветку-папараць, кветку шчасця.
Як жадалі мець гэту кветку
Цёмных пушчаў глухія шаты,
Каласы на бедных палетках,
Людзі ў цёмных, закураных хатах!
Ўсё было ў тую ноч звычайным:
Над агнямі лёталі цені,
Пяткі «Янку» прывычна чаканілі,
Пахла мёдам мурожнае сена.
За вячэру скупую сядалі
Дзеці бедныя пры лучыне;
Загубіўшы вянок, рыдала
Панам збэшчаная дзяўчына.
У клапоўніку лаяўся п'яны,
За карчмою кагосьці білі,
Хтось на пузе ляжаў адшмаганы,
І кабета над ім галасіла.
З каліты салёнай, парожняй
Залатоўку узяўшы ў рукі,
Дзед шпурляў яе ў «божае вогнішча»,
Каб сухоты пусцілі ўнука.
Ўся краіна над працай гарбела,
Ела бульбу, не бачыла сала,
Ўсе маліліся, ўсе цярпелі,
І ўсе, як нямыя, маўчалі.
І не ведалі вёскі ў дубровах,
Людзі хмурыя і палеткі,
Што ўсяму ўжо знайшлося Слова,
Што яно прагрыміць над светам,
Што язык залаты атрымалі
Ў гэту ноч пушчы цёмнай шаты,
Рэчак поўных лянівыя хвалі,
Занядбаныя, чорныя хаты.
Хоць нясцерпным ставала гора —
Наваколле пакуль што маўчала.
Ноч плыла агнямі і зорамі...
Нарадзіўся Янка Купала.

**1957**

**Раіса БАРАВІКОВА**

### У ВЯЗЫНЦЫ

Сын запытаўся: «Чый-та дом?»
Я адказала: «Дом Купалы».
За ліпу зачапіўся гром,
і неба ў сажалку упала.

Сцяжыны гравіевай хруст
тушыў дажджамі дзень імглісты,
і над мастком лазовы куст
глядзеўся песенна-ўрачыстым.

Журбой ці радасцю апеты,
ён сам спявае тут штогод:
тады ў народа ёсць паэты,
калі ў паэтаў ёсць народ...

Непераможаны ў навалах.
І не памыліцца рука:
шчытом яму — радок Купалы,
як полю — песня жаўрука.

Як Вязынцы — прамень заранкі
і тая дзіўная сцяна,
што помніць словы калыханкі,
якія мама ад цямна
у песню складвала для Янкі...

**1983**

**Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ**

* * *

Ноччу снежнай імгла пісала
Зноў шалёныя пісьмы мне.
Еўфрасіння і Янка Купала
Адлюстроўваліся ў акне.
Так сабраліся сёння разам
На пісьмовым адным стале,
Што нібы пасвятлела раптам
Мне ў зімовым халодным тле.

І ўварваўся зноў ранак сіні,
І ўплывала світанне ў дом,
Дзе Купала і Еўфрасіння
Паяднаны адным радком.
**2002**

**Леанід ДРАНЬКО-МАЙСЮК**

* * *

Да журбы дакранайся, нібы да жалеза;
Языком выцалоўвай марознае шкло,
Разумеючы простае: тое паэзія,
Што ніколі паэзіяй і не было.
Што ні ёсць — усё добра,
усё мае рацыю,
І пад каменем кожным
гадзючыцца верш...
Ты — паэт камарына-слязлівае нацыі
За здароўе сваё воцат п'еш!

Пі, закладнік сваёй дабрыні
з'алкаголенай,
Пі на зайздрасць падонкам,
няздарам усім —
Ты застаўся. А ім? Не застацца ніколі ім
Ні паэмай, ні вершам,
ні словам жывым;

Пі, усё безназоўнае любячы, помнячы,
Цень Купалы вітаючы прошчай сваёй...
Як цудоўна —
паэтам так сумна на поўначы!
Як цудоўна —
жалеза лагодзіць журбой!
**2000**

**Ірына БАГДАНОВІЧ**

## ВЯЗЫНКА

Каб душа не перастала
Быць з нябёсамі ў абдымкі,
Да Купалы, да Купалы —
Месца нашай пілігрымкі.

Незабудкі вышываюць
Малады дыван зялёны.
З дрэў русалачкі гукаюць
І калышуцца ўлюбёна.

Песняра свайго люляюць,
Ткуць замовы над калыскай,
Дбаюць, ах, яны-то дбаюць,
Каб тут чорт які не рыскаў.

Благаславёная мясціна,
Водар долу і паветра.
Гэта дружная гасціна
Будзіць сэрцаў нашых нетры:

Беларускіх сэрцаў вугаль
Зноў распалены Купалам!
Хто ідзе там полем-лугам?
Хто? І гляньце — іх нямала!

Гэта мы — не марнатраўцы,
Не бязродныя вандалы,
А зямлі сваёй дзяржаўцы,
Як прарочыў нам Купала!
**2006**

**Анатоль СЫС**

* * *

Журавы спяваюць паланез і іх
не шкада над беднай Беларуссю

я паэт прыгоннае паэзіі
і такім да смерці застануся

журавам не трэба ў зорнае жніво
з поўняй на гарбу ляцець на паншчыну
колькі б нас пасля Купалы ні жыло —
плюнеш — не паэты — самазванішчына

**1989**

### Валерыя КУСТАВА

* * *

*Мне сняцца сны*
*аб Беларусі...*
Я. КУПАЛА

Мне сніцца Беларусь
у верасовай хаце.
Мне сніцца Беларусь,
і сноў я не ганю.
Мне сніцца Беларусь
штоноч, павер мне, браце.
Мне сніцца Беларусь —
я ж сэрцу не зманю.
Мне сніцца Беларусь —
мая сівая маці.
Мне сніцца Беларусь —
ўзараная ралля.
Мне сніцца Беларусь,
бо я яе не страціў.
Мне сніцца Беларусь —
адзіная мая.

Перад табой, зямля,
я толькі немаўля.

**2001**

### Аксана СПРЫНЧАН

* * *

У лецe,
не апошнім і не першым,
шукаю свой пачатак і канец.
Яно жыве — халоднае, як смерць,
пакутнае, як нежаданне смерці.
У ім квітнеюць рудыя лілеі,
і знічкі падаюць —
шарсцінкі зорнай Рысі,
і першы раз сярпом зжынаю жыта,
і ўспамінаю —
я — «Жняя» Купалы.

Цяпер не страшна мне
знікаць у Леце.

**2003**

### Юлія НОВІК

* * *

Купала і Купалавы шляхі...
Адмерана, пражыта, праспявана.
І вось вітаюць вечнасці снягі
Купалаў самы першы ранак.
Забыўся ўрэшце самы цёмны дзень.
Лёс вызначыў. Паэт адбыўся.
Ягоных слоў прасветленых прамень
Адбіўся ў сэрцах і мільённа
пaўтарыўся.

**2007**